*Окончание табл.*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| средне-<br>язычные | передне-<br>небные | | | | | | | | j<br>i | |
| задне-<br>язычные | задне-<br>небные | g<br>г'<br>г'' | k<br>к<br>к' | г<br>г' | х<br>х' | | | ŋ | | |
| Гортанный | | | | | h | | | | | |

***С.В. Агароднікава***
Мінск

# МЕТАДЫ І ФОРМЫ КАНТРОЛЮ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў СТУДЭНТАЎ 1 КУРСА

Необходнасць разнастайнасці формаў кантролю пры вывучэнні асобных раздзелаў беларускай мовы.

Арфаграфія.

1. Тлумачальная слоўнікавая дыктоўка і выкарыстанне картак-заданняў з мэтай кантролю па засваенні пэўных арфаграм.

2. Кантрольная работа па заканчэнні вывучэння раздзела “Арфаграфія”. Выкарыстанне некалькіх варыянтаў для кантролю за самастойнасцю працы студэнтаў. Разнастайнасць практыванняў па такіх асабліва складаных тэмах, як “Правапіс галосных у іншамоўных словах” і “Правапіс некаторых спалучэнняў зычных”.

Марфалогія

1. Вуснае апытванне па тэме “Назоўнік” з мэтай праверкі ведаў студэнтаў граматычных катэгорый назоўніка.

2. Кантрольны пераклад мастацкага або публіцыстычнага тэксту з мэтай праверкі засваення такіх тэм, як “Лік назоўнікаў”, “Род назоўнікаў”, “Ступені параўнання прыметнікаў”, “Ужыванне ў беларускай мове дзеепрыметнікаў”.

3. Выкарыстанне картак-заданняў для самастойнай працы студэнтаў з мэтай праверкі іх ведаў па тэмах “Склонавыя канчаткі назоўнікаў 1 скланення” і “Склонавыя канчаткі назоўнікаў у множным ліку”.

4. Выкарыстанне картак-тэстаў як формы кантролю па засваенні студэнтамі тэмы “Склонавыя канчаткі назоўнікаў 2 скланення”

5. Кантрольная дыктоўка з граматычным заданнем. Улічванне ступені засваення матэрыялу кожнай групай студэнтаў пры падборы тэм для граматычнага задання.

Лексічны мінімум і эканамічная тэрміналогія.

1. Слоўнікавая дыктоўка, сачыненне— мініяцюра як формы кантролю па засваенні асобных лексічных тэм.

2. Вусны і пісьмовы пераказы мастацкага тэксту з мэтай праверкі правільнага выкарыстання стылістычных асаблівасцяў беларускай мовы.

3. Кантрольны творчы пераказ мастацкага тэксту.

4. Індывідуальныя кантрольныя пытанні па эконамічных тэкстах для праверкі здольнасцяў правільна карыстацца эканамічнымі тэрмінамі.

5. Кантрольны пераклад эканамічнага тэксту з рускай мовы на беларускую з мэтай праверкі ведаў студэнтаў эканамічнай тэрміналогіі.

*Т.Л. Поляк*
Мінск

# АСВЯТЛЕННЕ МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫХ ПРАБЛЕМ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў НЕФІЛАЛАГІЧНЫМ ВУЗЕ

Як вядома, не можа быць навучання без выхавання. Менавіта з гэтай нагоды, як здаецца, атрымала развіцце сістэма гуманітарызацыі ў нефілалагічных вузах, накіраваная на фарміраванне гарманічна развітай асобы маладога чалавека рознай прафесіі.

Мова як сродак зносін і выражэння ўласных думак, пачуццяў, эмоцый, як сродак удасканалення духоўнага свету чалавека мае вялікую магчымасць уплываць на станаўленне асобы, фарміраваць маральна-этычныя каштоўнасці, погляды на жыцце.

Менавіта пагэтаму імкнемся ўлічваць прафесійныя інтарэсы студэнтаў-медыкаў I курса на занятках па беларускай мове, звяртаючыся да дыянталогіі — навуцы аб урачэбнай этыцы, пачынаючы з глыбокага вывучэння і ў пашыраных размовах абмеркавання артыкула “Якім павінен быць урач”, прыводзім студэнтаў да высновы, што такія маральныя чалавечыя якасці, як сумленне, дабрыня, чулліваць, спагада, бескарыслівасць, пачуцце адказнасці, працалюбства, любоў да людзей, прынцыповасць, адданасць сваей справе складаюць духоўную сутнасць чалавека, абраўшага прафесію медыка. Пры гэтым сканцэнтроўваем увагу студэнтаў на адносіны ўрача да хворага, дзе яны павінны кіравацца прынцыпам: урач для хворага, а не наадварот (Гіпакрат).

З мэтай паглыблення гэтай суразмовы звяртаемся да мастацкіх твораў сучаснай беларускай літаратуры, напрыклад, да драмы М. Матукоўскага “Бездань”, у якой медыцынская тэма непадзельна звязана з тэмай экалогіі і маралі. Бездань экалагічная тут высвятляе бездань чалавечай душы.

Маральна-этычнай праблематыкай вылучаецца проза Андрэя Федарэнкі. У аповесці “Ланцуг” пацягнуўся ланцужок трагічных падзей, які скончыўся становуча для героя, урача Вінярскага. Тут востра разглядаецца праблема маральнага ачышчэння ў грамадстве.

Неабходна ўлічваць, што чалавек кожнай прафесіі акружаны пэўным асяроддзем і таму варта звяртацца да агульначалавечай маралі (не толькі прафесійнай).

Знакаміты пісьменнік Міхаіл Герчык апрача медыцынскай тэмы (“Здабыцце надзеі”, “Вяртанне да сябе”) звярнуў асаблівую ўвагу на станаўленне характару падлетка, выявіўшы глыбокае разуменне дзіцячай душы (“Ляці,